Ігар Анатольевіч Плышэўскі

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Ігар Анатольевіч Плышэўскі (нар. 19 лютага 1979, Любань, Мінская вобласць, БССР, СССР) — беларускі юрыст, начальнік галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага гарвыканкама, член Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Рэспублікі Беларусь ад Мінска.

Ігар Анатольевіч Плышэўскі	
Род дзейнасці	юрыст
Дата нараджэння	19 лютага 1979 (44 гады)
Месца нараджэння	Любань, Любанскі раён, Мінская вобласць, БССР, СССР
Альма-матар	Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (2001)

Біяграфія

У 2001 годзе скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы па спецыяльнасці «Правазнаўства», у 2004 годзе — аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Працаваў галоўным спецыялістам аддзела абагульнення судовай практыкі ўпраўлення забеспячэння нагляду і абагульнення судовай практыкі Вышэйшага Гаспадарчага суда Рэспублікі Беларусь, сакратаром Пленума — памочнікам першага намесніка старшыні Вышэйшага гаспадарчага суда, сакратаром Пленума аддзела прававога забеспячэння дзейнасці судовых інстанцый кіраўніцтва справамі Вышэйшага Гаспадарчага суда. З 2012 года — намеснік начальніка ўпраўлення кадраў і ідэалагічнай работы Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь[1].

У 2012 годзе прайшоў перападрыхтоўку на базе Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай».

З 8 снежня 2014 года працуе начальнікам галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага гарвыканкама[2].

Санкцыі ЕС, ЗША і іншых краін

31 жніўня 2020 года Плышэўскі быў уключаны ў спіс асобаў, на якіх накладзена бестэрміновая забарона на ўезд у Латвію, пяцігадовая забарона на ўезд у Эстонію і забарона на ўезд у Літву ў сувязі з тым, што *«сваімі дзеяннямі ён арганізаваў і падтрымаў фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня і наступнае гвалтоўнае задушэнне мірных пратэстаў»*[3].

2 кастрычніка 2020 года Плышэўскі трапіў у Чорны спіс Еўрасаюза[4][5]. Пры абгрунтаванні ўвядзення санкцый было адзначана, што Плышэўскі як член ЦВК нясе адказнасць за парушэнне правілаў выбарчага працэсу падчас прэзідэнцкіх выбараў 2020 года: невыкананне асноўных міжнародных стандартаў справядлівасці ды празрыстасці і фальсіфікацыю іх вынікаў[6]. Разам з калегамі па ЦВК Плышэўскі, у прыватнасці, на фальшывых падставах арганізаваў нядопуск некаторых кандыдатаў ад апазіцыі і ўвёў непрапарцыйныя абмежаванні для назіральнікаў на выбарчых участках, а таксама забяспечыў прадузяты склад выбарчых камісій, якія знаходзіліся пад наглядам ЦВК[6]. 20 лістапада да санкцый ЕС далучыліся Албанія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя і Украіна[7]. Акрамя таго, Плышэўскага ў свае санкцыйныя спісы ўключылі Вялікабрытанія[8][9], Канада[10], Швейцарыя[11][12][13].

21 чэрвеня 2021 года Плышэўскі таксама быў унесены ў спіс спецыяльна прызначаных грамадзян і заблакіраваных асоб ЗША[14][15].

Зноскі

1. В Министерстве юстиции (https://justbel.info/archive/Article/768) Архівавана (https://web.archive.org/web/20200909013100/https://justbel.info/archive/Article/768) 9 верасня 2020.
2. Главное управление юстиции Мингорисполкома возглавил Игорь Плышевский (https://minsknews.by/glavnoe-upravlenie-yustitsii-mingorispolkoma-vozglavil-igor-plyishevskiy/) Архівавана (https://web.archive.org/web/20210830183657/https://minsknews.by/glavnoe-upravlenie-yustitsii-mingorispolkoma-vozglavil-igor-plyishevskiy/) 30 жніўня 2021.
3. Латвія, Літва і Эстонія ўключылі Лукашэнку і яшчэ 29 чыноўнікаў ў спіс пэрсон нон-грата. ПОЎНЫ СЬПІС (https://www.svaboda.org/a/30812996.html)
4. *Best, Tom; Bonucci, Nicola; Bukowski, Gesa; Hutchison, Talya*. Protests in Belarus - EU imposes Fresh Sanctions on the Belarusian Regime and Follows the UK, US and Canada in Imposing Sanctions on Lukashenko (https://www.lexology.com/library/detail.aspx?g=5c658b4d-1bea-4d29-9820-45679aa5438a) (англ.). *Paul Hastings LLP*. Lexology (17 лістапада 2020). Архівавана (https://archive.ph/20210724145733/https://www.lexology.com/library/detail.aspx?g=5c658b4d-1bea-4d29-9820-45679aa5438a) з першакрыніцы 24 ліпеня 2021. Праверана 16 верасня 2021.
5. 40 беларускіх чыноўнікаў, якія трапілі пад санкцыі Эўразьвязу. Сьпіс (https://www.svaboda.org/a/30870774.html) (бел. (тар.)). Беларуская служба Радыё «Свабода» (2 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2021.
6. Council Implementing Regulation (EU) 2021/339 of 25 February 2021 implementing Article 8a of Regulation (EC) No 765/2006 concerning restrictive measures in respect of Belarus (http://data.europa.eu/eli/reg_impl/2021/339/oj/eng) (англ.) (26 лютага 2021). Праверана 24 ліпеня 2021.
7. Declaration by the High Representative on behalf of the EU on the alignment of certain third countries concerning restrictive measures against Belarus (https://www.consilium.europa.eu/en/press/press-releases/2020/11/20/declaration-by-the-high-representative-on-behalf-of-the-eu-on-the-alignment-of-certain-third-countries-concerning-restrictive-measures-against-belarus/) (англ.). Савет Еўрапейскага саюза (20 лістапада 2020). Праверана 13 верасня 2021.

8. CONSOLIDATED LIST OF FINANCIAL SANCTIONS TARGETS IN THE UK (https://assets.publishing.service.gov.uk/government/uploads/system/uploads/attachment_data/file/996772/Belarus.pdf) (англ.). Office of Financial Sanctions Implementation HM Treasury (25 чэрвеня 2021).
9. *Staff, Reuters*. UK sanctions Belarus leader Lukashenko (https://www.reuters.com/article/us-belarus-election-sanctions-britain-ra-idUSKBN26K2IJ) (англ.). Reuters (29 верасня 2020). Архівавана (https://archive.ph/20210724145005/https://www.reuters.com/article/us-belarus-election-sanctions-britain-ra-idUSKBN26K2IJ) з першакрыніцы 24 ліпеня 2021. Праверана 24 ліпеня 2021.
10. Consolidated Canadian Autonomous Sanctions List (https://www.international.gc.ca/world-monde/international_relations-relations_internationales/sanctions/consolidated-consolide.aspx?lang=eng) (англ.). Міністэрства міжнародных спраў Канады (19 кастрычніка 2015). Праверана 29 чэрвеня 2021.
11. Switzerland joins EU in sanctions against top Belarus officials (https://www.swissinfo.ch/eng/switzerland-joins-eu-in-sanctions-against-top-belarus-officials/46094856) (англ.). Swissinfo (13 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2021.
12. SECO: Ordinance on measures against Belarus (https://www.seco.admin.ch/seco/en/home/seco/nsb-news.msg-id-80696.html) (англ.). Дзяржаўны сакратарыят па эканамічных пытаннях (13 кастрычніка 2020). Праверана 13 верасня 2020.
13. Sanctions program: Belarus: Verordnung vom 11. Dezember 2020 über Massnahmen gegenüber Belarus (SR 946.231.116.9), Anhang 1 Origin: EU Sanctions: Art. 2 Abs. 1 (Finanzsanktionen) und Art. 3 Abs. 1 (Ein- und Durchreiseverbot) (https://www.seco.admin.ch/dam/seco/de/dokumente/Aussenwirtschaft/Wirtschaftsbeziehungen/Exportkontrollen/Sanktionen/Verordnungen/Belarus/belarus_2021-07-07.pdf.download.pdf/Belarus_2021-07-07.pdf) (англ.). Дзяржаўны сакратарыят па эканамічных пытаннях (7 ліпеня 2021). Архівавана (https://web.archive.org/web/20210707175409/https://www.seco.admin.ch/dam/seco/de/dokumente/Aussenwirtschaft/Wirtschaftsbeziehungen/Exportkontrollen/Sanktionen/Verordnungen/Belarus/belarus_2021-07-07.pdf.download.pdf/Belarus_2021-07-07.pdf) з першакрыніцы 7 ліпеня 2021. Праверана 10 ліпеня 2021.
14. OFAC Sanctions List Search (https://sanctionssearch.ofac.treas.gov/), Міністэрства фінансаў ЗША
15. Belarus Designations; Issuance of Belarus General License 3 and related Frequently Asked Questions (https://home.treasury.gov/policy-issues/financial-sanctions/recent-actions/20210621) (англ.). Праверана 24 ліпеня 2021.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Ігар_Анатольевіч_Плышэўскі&oldid=4473065"